# ЛІНГВАКУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЯГО РЭАЛІЗАЦЫЯ Ў ШКОЛЬНЫМ ПАДРУЧНІКУ



**С.В. Мартынкевіч,**
*дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства*
*ВДУ імя П.М. Машэрава*

Дэклараваныя адукацыйным стандартам і вучэбнай праграмай па беларускай мове лінгваметадычныя падыходы скіроўваюць да распрацоўкі дзейнаснай асновы навучання, пошукаў новых методык, якія паспрыялі б авалоданню беларускай мовай як сродкам зносін. Відавочна, што ў сітуацыі білінгвізму, калі беларуская мова не з'яўляецца актыўным сродкам камунікацыі для сучаснага вучня, назіраюцца пэўныя цяжкасці ў актыўным выкарыстанні мовы.

Таму пры адборы дыдактычнага зместу ў такім выпадку варта перш за ўсё вылучыць лінгвакраіназнаўчы аспект. Новае пакаленне падручнікаў у поўнай меры адпавядае патрабаванням лінгвакультуралагічнага падыходу і рэалізуе лінгвакраіназнаўчы кірунак. Гэта перш за ўсё прадугледжвае "такую арганізацыю вывучэння мовы, дзякуючы якой школьнікі знаёмяцца з сучасным і мінулым народа, з яго нацыянальнай культурай пасродкам мовы і ў працэсе авалодання ёй" (Я.М. Верашчагін і В.Р. Кастамараў). Задача авалодання мовай як сродкам зносін у такім выпадку пазбаўляецца фармальнага характару.

Лінгвакультуразнаўчы змест вучэбных дапаможнікаў прадстаўлены дыдактычнымі тэкстамі, якія з'яўляюцца крыніцай інфармацыі пра пэўныя гісторыка-культурныя рэаліі, персаналіі, гістарычныя, прыродныя і геаграфічныя факты, іх адметнасц, месца і значэнне ў развіцці краіны. Асобую дыдактычную каштоўнасць нясуць лексічныя адзінкі, якія маюць нацыянальна-культурны кампанент значэння.

З пазіцыі лінгваметодыкі важна, каб граматычныя факты былі ілюстраваны лінгвакультуразнаўчым матэрыялам, а сістэма практыкаванняў уключала заданні, якія арганічна спалучалі б разгляд моўнай з'явы і аналіз асаблівасцей лексічных адзінак, якія прэзентуюць шырокі лінгвакультурны кантэкст.

Найбольш значымым матэрыялам з'яўляюцца ўстойлівыя моўныя адзінкі, у якіх рэпрэзентуецца нацыянальна-культурныя феномены праз лексічныя адзінкі з пераносным значэннем, асабовыя імёны. Напрыклад, пры вывучэнні тэмы "Сказ як сінтаксічная адзінка" арганізацыя дыдактычнага матэрыялу сфакусавана вокол персаналіі Францыска Скарыны і знакавага факта ў гісторыі Беларусі – выдання першай друкаванай кнігі (практ. 133, 134, 137) [2, с. 78]. Змест практыкаванняў знаёміць вучняў з асобнымі падзеямі з жыцця славутага земляка, звесткамі пра яго бацьку, этапамі дзейнасці асветніка. Матэрыял тэкстаў дапаўняецца малюнкамі (практ. 134). Метадычны апарат арганізацыі працы пры вывучэнні тэмы распрацаваны такім чынам, што замацоўваюцца сінтаксічныя веды і ўменні (сказ як асноўны сродак перадачы думкі, інтанаванне, падзел тэксту на сказы, афармленне на пісьме, адрозненне сказа ад словазлучэння і слова), а разам з гэтым фарміруюцца лінгвакраіназнаўчыя веды і ўменні (запамінанне інфармацыі пра

Францыска Скарыну, выбар патрэбных звестак, складанне вуснага выказвання "Беларускі першадрукар").

Этнаграфічныя і бытавыя краіназнаўчыя рэаліі прэзентуюцца праз уключэнне ў тэксты лексічных адзінак. якія называюць прадметы побыту, ежы, напояў. Такія лексемы могуць быць кампенентам фразеалагізмаў і парэмій, устойлівых параўнанняў. Напрыклад, замацаванне тэмы "Склон назоўнікаў. Асновы назоўнікаў" [3, с. 90] адбываецца на аснове практыкаванняў з празаічнымі і вершаванымі тэкстамі пра Беларусь з уключэннем інфармацыі пра элементы побытавай культуры беларусаў.

**191.** Спішыце тэкст, ужываючы назоўнікі ў патрэбнай форме. Абазначце склон гэтых назоўнікаў.



Пра *(чалавек)* з дрэннай памяццю кажуць: «Галава як рэшата». Рэшата — гэта не жывая істота, а то і пакрыўдзіцца б магло.

Складаецца рэшата з *(абадок)* і сеткавага *(дно)*. Абадок рабілі звычайна з ліпавай ці вязавай *(кара)*. *(Сетка)* плялі з лубянога *(валакно)* або конскага воласу. Праз дробную *(сетку)* прасейвалі *(мука)* — на хлеб, на аладкі. Дарэчы і загадкі: «Новая пасудзіна, а ўся ў дзірках», «Пад ліпавым *(куст)* мяцеліца[Ф] мяце».

Сіта і ў нашы дні бывае белым ад *(мука)*. Праўда, цяпер яго выгінаюць не з кары, а робяць з *(фанера*)*, дно — з металічнай *(сетка)* *(Паводле М. Маляўкі)*.

*рэшата*

Успомніце іншыя фразеалагізмы, якія характарызуюць чалавека з дрэннай памяццю.

Адгадайце загадкі, якія ўключаны ў тэкст. Складзіце слоўнікавы артыкул да слова-адгадкі.

Метадычны апарат арганізацыі працы і змест тэксту ў поўнай меры ілюструе лінгвакультуралагічны аспект працэсу навучання. Назва прадмету побыту – ***рэшата*** – з'яўляецца кампанентам устойлівага параўнання, падаецца інфармацыя, як выглядае прадмет і для чаго выкарыстоўваецца ў гаспадарцы. Цікавым элементам з'яўляюцца загадкі. Да таго ж слова ***рэшата*** з'яўляецца слоўнікавым словам , правапіс якога павінны запомніць вучні.

Далей мэтазгодна працягнуць працу са сталымі эпітэтамі, уласна беларускай лексікай, выбранымі з вершаў "Беларус" В. Жуковіча (практ. 194) і "Твая Беларусь" Ю. Свіркі (практ. 196), якая прэзентуе інфармацыю пра асаблівасці характару беларусаў, іх ладу жыцця (***Белы ручнік***, ***белы абрус***, *сам я* ***няцёмны душою****....//* ***Добрым*** *служыць* ***запаветам****...*), геаграфічнае размяшчэнне (*"Мяжуе з Польшчай, / Украінай, / Расіяй, Латвіяй, Літвой..."*). Увядзенне лексічных адзінак у маўленчы кантэкст, праца над граматычнымі характарыстыкамі слова, выяўленне адрозненняў яго граматычных формаў спрыяе запамінанню ўласна беларускай лексікі.

Прэзентацыя інфармацыі пра беларускія гарады, адметныя факты з гісторыі іх узнікнення адбываецца праз спалучэнне граматычных ведаў са звесткамі лінгвакраіназнаўчага характару. Граматычная інтэрпрэтацыя лексічных адзінак накіравана на фарміраванне трывалых моўных уменняў, у той час як прыём сінтаксічнай

трансфармацыі накіраваны на фарміраванне ўменняў будаваць сказы і разам з гэтым запамінанне інфармацыі.

218. Адкажыце на пытанні краязнаўчай віктарыны «Гарады Беларусі». Складзіце сказы, выкарыстоўваючы інфармацыю, пададзеную ў дужках.

1. Пад якім горадам да пачатку 1990-х гг. размяшчаўся гарнізон марской авіяцыі Балтыйскага флоту?*(Быхаў.)*

2. На гербе якога горада знаходзяцца чырвоная лісіца і рука, якая трымае меч? *(Мсціслаў.)*

3. Сімвалам якога горада з'яўляецца вежа з гадзіннікам? *(Шчучын.)*

4. У якім горадзе знаходзіцца помнік князю Барысу? *(Барысаў.)*

5. У якім беларускім горадзе знаходзіцца помнік агурку? *(Шклоў.)*

Запішыце сказы. Падкрэсліце назвы гарадоў. Абазначце канчаткі і вызначце склон гэтых назоўнікаў. Вусна пастаўце назоўнікі, якія абазначаюць назвы гарадоў, у форму творнага склону. Якія канчаткі яны маюць?

Закладзеная ў вучэбных дапаможніках сістэма практыкаванняў лінгвакраіназнаўчага характару дазваляе актуалізаваць вывучаныя веды, паўтараць і нарошчваць інфармацыю, выяўляючы нацыянальна-культурную спецыфіку моўных адзінак.

280. Прачытайце інфармацыю пра старажытныя гарады Беларусі.

Параўнайце беларускія гарады, выкарыстоўваючы выразы: *найстаражытнейшы ..., самы старажытны ..., маладзейшы за ..., старэйшы, чым ..., больш старажытны за ..., менш старажытны, чым ...* .

Які беларускі горад з'яўляецца самым старажытным? Пісьмова адкажыце на пытанне, ужываючы простую форму найвышэйшай ступені параўнання.

Складзіце «Кнігу геаграфічных рэкордаў Беларусі»: запішыце некалькі сказаў пра «самых-самых».

**Найстаражытнейшыя гарады Беларусі**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Полацк | 862 г. |
| 2 | Віцебск | 974 г. |
| 3 | Тураў | 980 г. |
| 4 | Заслаўе | 985 г. |
| 5 | Ваўкавыск | 1005 г. |
| 6 | Брэст | 1019 г. |
| 7 | Навагрудак | 1044 г. |
| 8 | Браслаў | 1065 г. |
| 9 | Мінск | 1067 г. |
| 10 | Орша | 1067 г. |
| 11 | Лагойск | 1078 г. |
| 12 | Пінск | 1097 г. |
| 13 | Давыд-Гарадок | 1100 г. |
| 14 | Барысаў | 1102 г. |
| 15 | Слуцк | 1116 г. |

Інфармацыя пра найбольш вядомыя факты ў сучасным грамадскім жыцці рэпрэзентуецца ў анамастычных адзінках: тапонімах, антрапонімах, назвах прыродных аб'ектаў, гандлёвых марак прадукцыі, рэкламных назвах.

Напрыклад, вядомыя брэнды "Спартак", "Камунарка" выклікаюць самыя прыемныя асацыяцыі ў кожнага беларуса, бо таварныя знакі кандытарскіх фабрык вядомыя ўсім з дзяцінства. Таму тым больш цікавай для вучняў будзе інфармацыя пра месца знаходжання фабрыкі, яе значэнне для сучасных эканамічных працэсаў у жыцці краіны.

344. Прачытайце тэкст. Абгрунтуйце яго падзел на абзацы.

**Краіна цукерак і дзяцінства**

Адны з самых смачных салодкіх прысмакаў* у Беларусі робяць на **гомельскай** фабрыцы «Спартак».

Здаецца, няма ў свеце чалавека, які не частаваўся б цукеркай «Залаты ключык». Гэтыя ірыскі былі вельмі папулярныя ў нашых бабуль і дзядуль. Яшчэ ў сярэдзіне мінулага стагоддзя за восем гадзін спецыяльная машына-аўтамат магла вырабіць пяцьсот кілаграмаў такіх цукерак!

Сёння прадпрыемства штомесяц выпускае два мільёны кілаграмаў цукерак, карамелі, шакаладу і вафляў. Галоўнае месца на «Спартаку» займае вытворчасць шакаладу і **шакаладных** цукерак. Пакаштаваць іх амаль праз некалькі хвілін пасля выпуску, а таксама паласавацца гарачым духмяным шакаладам можна ў **фірменным** кафэ на фабрыцы.

Калі будзеце ў Гомелі, завітайце на «Спартак», каб апынуцца ў чароўнай краіне цукерак і дзяцінства! *(Паводле І. Зімневай).*

Складзіце і запішыце план тэксту. Выпішыце з тэксту апорныя словы (прыметнікі), якія адпавядаюць кожнаму пункту плана. Карыстаючыся планам і апорнымі словамі, вусна перакажыце тэкст.

Заданні да тэксту дапамогуць пашырыць веды, актывізаваць матэрыял, які мае краіназнаўчы змест і будзе каштоўны ў камунікатыўным плане.

Своеасаблівымі "згусткамі" нацыянальна-культурнай інфармацыі з'яўляюцца народныя анекдоты, жарты, у якіх выяўляецца адметнасць гумару беларускага народа. У іх расказваецца пра асаблівасці жыцця, гаспадарчай і культурнай дзейнасці, менталітэту беларусаў. Фонавыя веды сацыяльнага характару ў такіх выпадках будуць вельмі важнымі для разумення тонкага гумару, нацыянальна-культурнага адцення агульнага сэнсу народнага апавядання.

**143.** Прачытайце тэкст. Чаму ён так называецца? Колькі чалавек пастукалася да гаспадара?

**Толькі аднаго**

Да аўцюкоўца **пастукалі** ноччу:
— Пусціце пераначаваць.
— Хто вы?
— Я шафёр... **Вадзіцель**... Механік... Разумееце?
Аўцюковец на хвіліну задумаўся, пасля адказаў:
— Магу пусціць толькі аднаго *(Паводле У. Ліпскага)*.

Пра якія словы ветлівасці забыўся госць?

Каб зразумець гумарыстычную ідэю прыведзенага тэксту-жарту, вучні павінны валодаць ведамі рэгіянальнага характару пра вёску Аўцюкі, якія з'яўляюцца фонам для разгадкі сэнсу. Аўцюкі – вёска ў Гомельскай вобласці, дзе праходзіць беларускі фестываль гумару. Аўцюкоўцы вядомыя беларусам як дасціпныя, кемлівыя людзі. У апавяданнях пра аўцюкоўцаў выяўляецца нацыянальны каларыт, сацыяльныя асаблівасці беларускай культуры. Валоданне такімі фонавымі ведамі дапамагае зняць пэўныя сэнсавыя бар'еры і спасцігнуць дадатковую канатацыю, якая транслюе звесткі нацыянальна-культурнага характару.

Такім чынам, канцэптуальная ідэя вучэбных дапаможнікаў новага пакалення – арганічнае фарміраванне заяўленых адукацыйнымі стандартамі кампетэнцый – моўнай, маўленчай, камунікатыўнай, лінгвакультуралагічнай. Аднак дасканалае авалоданне ведамі і ўменнямі не можа адбывацца без улікаў пэўных аспектаў вучэбнага працэсу. Вылучаны лінгвакраіназнаўчы аспект выкладання беларускай мовы паспрыяе павышэнню культурнага ўзроўню, выхаванню нацыянальна свядомай асобы, якая праз мову і культуру ідэнтыфікуе сябе з беларускім народам. Для гэтага ў вучэбныя дапаможнікі закладзена сістэма заданняў, накіраваная як на засваенне не толькі лінгвістычнай, але і пазалінгвістычнай інфармацыі.

**Літаратура**

1. Арцямёнак, Г., Півавар, К. Краіназнаўства ў люстэрку лінгвістыкі / Г. Арцямёнак, К. Півавар // Беларуская мова як замежная. – № 3, 2019. – С. 43 – 54.
2. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. А. Валочка, В.У. Зелянко, С.В. Мартынкевіч, С.М. Якуба. — Мінск : Нац. інт адукацыі, 2019.
3. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. А. Валочка, В.У. Зелянко, С.В. Мартынкевіч, С.М. Якуба. — Мінск : Нац. інт адукацыі, 2019.
4. Верещагин, Е.М. Костомаров, В.Г. Язык и культура : Лингвострановедение в преподавании русского язык как иностранного. – М. 1990.